# МІЖНАРОДНЫ КАНГРЭС ДАСЛЕДЧЫКАЎ БЕЛАРУСІ

Паважанае спадарства,

Звяртаем Вашу ўвагу, што **5 сакавіка** завяршаецца прыём заявак на арганізацыю спецыялізаваных секцый (панэляў) у межах Міжнароднага Кангрэса даследчыкаў Беларусі (28-30 верасня 2012 г.; Коўна, Літва).

**Секцыі (панэлі)** могуць быць прысвечаны абмеркаванню асобных даследчых праблем ці прэзентацыі вынікаў навуковай дзейнасці ў межах асобных дысцыплін ці даследчых накірункаў. Пры падачы матэрыялаў арганізацыйны камітэт **не ставіць тэматычных ці дысцыплінарных абмежаванняў**, пакідаючы магчымасць прадстаўнікам акадэмічнай і экспертнай супольнасці самастойна артыкуляваць свае прыярытэты і зацікаўленасці.

Секцыі (панэлі) могуць быць **дысцыплінарнымі, тэматычнымі** ці нават **вузкаспецыялізаванымі**. Таксама прымаюцца заяўкі на арганізацыю секцый для разгляду актуальных грамадскіх пытанняў.

Мы спадзяемся, што фарміраванне секцый і панеляў праз адкрыты збор прапановаў дазволіць павысіць адпаведнасць Міжнароднага Кангрэса даследчыкаў Беларусі **чаканням і патрэбам** акадэмічнай і экспертнай супольнасці.

Арганізацыйны камітэт запрашае даследчыя арганізацыі і супольнасці, а таксама акадэмічных лідараў прыняць удзел у вызначэнні тэматычных прыярытэтаў наступнага Кангрэса.

Заяўка можа быць як калектыўнай, так і індывідуальнай. Заяўнікамі таксама могуць выступаць зацікаўленыя інстытуцыі і арганізацыі.

Для падачы заяўкі да **5 сакавіка 2012 года** на электронны адрас Кангрэса (icbs@palityka.org) неабходна даслаць:

1) папярэднюю назву секцыі (панэлі);
2) кароткую канцэпцыю (каля аднаго абзаца);
3) папярэдні спіс магчымых удзельнікаў.

З павагай,

Арганізацыйны камітэт

Міжнародны Кангрэс даследчыкаў Беларусі – штогадовая сустрэча беларускіх і замежных навукоўцаў, экспертаў, аналітыкаў, прадстаўнікоў грамадскіх і дзяржаўных інстытуцый, якія займаюцца даследаваннем Беларусі. Праца Кангрэса дазваляе магчымасць выступу 150-200 спецыялістам з розных дысцыплін.

Міжнародны Кангрэс даследчыкаў Беларусі арганізуецца Кансорцыумам акадэмічных і экспертных арганізацый Беларусі, Літвы, Польшчы і іншых краін. Больш падрабязна глядзіце сайт www.icbs.lt